1937 г. Рада магістрата горада Гродна прыняла рашэнне набыць ўчастак зямлі ў Яна і Марыі Друцкіх-Любецкіх пад гарадскі заапарк.

Летам 1944 г. ў будынку размясціўся 132-гі палявы перасоўны шпіталь 50-й арміі, дзесяткі воінаў, якія не выжылі, былі пахаваны ў парку, там дзе зараз знаходзяцца канцэртная пляцоўка і дзіцячыя атракцыёны.

З 1948 да 1951 гг., калі будынак быў перададзены Гродзенскаму сельскагаспадарчаму інстытуту, у ім знаходзіўся Гродзенскі абласны камітэт КПБ, які ўзначальваў Сяргей Восіпавіч Прытыцкі. З 25 кастрычніка 1951 г. пачаліся заняткі на двух факультэтах – агранамічным і заатэхнічным. Зараз тут размешчаны корпус біятэхналагічнага факультэта.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Соркіна І.Навучальныя ўстановы, настаўнікі і вучні г.Гродна ў 60-я гады XIX – пачатку XX ст.//Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры ў XVI-XX ст. / Пад рэд. А.Ф.Смаленчука, Н.У.Сліж. – Мінск:Зміцер Колас, 2011. – С.355-394.
2. Гродненское реальное училище цесаревича Алексея. [Электронны рэсурс]: http://forum.grodno.net/index. php?topic=73033.115;imode.
3. Чернякевич А., Трусов И. «Новый Свет» и его окрестности / А. Чернякевич, И.Трусов. 2009. – с.68. [Электронны рэсурс] http://www.lib.grsu.by/ library/data/resources/catalog/164377-358776.pdf.
4. Игнатович, Ф.И. Гродненский учитель-новатор И.И. Кохановский / Ф.И. Игнатович, Д.П. Тарасюк // Кіраванне ў адукацыі. – 2012. – № 4. – С. 60-64.
5. Юры Камягін. Вайсковыя могілкі з танцпляцоўкай і пакоем смеху /[Электронны рэсурс] http://www.t-styl.info/by/114/our_region/9783.

УДК 316.7

## САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ФУНКЦЫІ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

**Янчалоўская С.М.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Сацыялогія мастацтва – спецыяльная галіна сацыялогіі, якая вывучае мастацкую сферу грамадства як сацыяльны фенамен, што выступае носьбітам інфармацыі аб формах узаемадзеяння чалавека, грамадства і культуры. Яе дасягненні ўтвараюць тэарэтыка-метадалагічную аснову эмпірычных даследаванняў мастацтва [1].

На прыкладзе гістарычнага развіцця беларускага мастацтва разглядаецца праблема сацыякультурных функцый, якія выконваюць мастацкія творы ў грамадстве. Асноўнымі з іх з’яўляюцца: эстэтычная,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

геданістычная, экзістэнцыяльная, дакументальная, інфармацыйная, камунікатыўная, пазнаваўчая, выхаваўчая, светапоглядна-ідэалагічная, грамадска-пераўтваральная. Пры гэтым у пэўныя гістарычныя перыяды пераважаюць тыя ці іншыя функцыі.

Гісторыя мастацкай культуры Беларусі вызначалася развіццём моцна еўрапеізаванага, і ў той жа час самабытнага мастацтва. Яе станаўленне адлюстроўвала спалучэнне агульнаеўрапейскіх змен са зменамі ў нацыянальнай культуры, дзякуючы чаму фарміраваліся спецыфічныя якасці мастацтва. Першая вынікае з таго, што ***на яго развіццё моцна ўплывалі палітычныя і саслоўныя фактары. Другая сведчыць аб п***еравазе ў мастацкай культуры пазаэстэтычных функцый.

Як частка еўрапейскага, гісторыя беларускага мастацтва адпавядае агульнаеўрапейскай культуралагічнай перыядызацыі: на працягу 16-20 стагоддзяў адбывалася змена перыядаў Адраджэння, Новага і Навейшага часу [2]. Адраджэнне ў беларускім мастацтве перыяду Вялікага Княства Літоўскага найбольш выразна праявілася ў 16 – першай палове 17 стагоддзяў, калі ва ўзаемадзеянні рэнесанснага антрапацэнтрычнага і індывідуалістычнага светапогляду з нацыянальным адбывалася фарміраванне сармацкай мастацкай традыцыі, адпаведна якой мастацтва павінна было адлюстроўваць выключнае становішча шляхты ў грамадстве [3]. Асаблівасцю беларускага мастацтва ў дадзены перыяд з’яўляецца перавага дакументальна-інфармацыйнай і светапоглядна-ідэалагічнай функцый.

У эпоху Новага часу ў беларускай мастацкай культуры перыяду Рэчы Паспалітай адбываўся сінтэз агульнаеўрапейскага рацыяналізму і асветніцтва з сармацкай ідэалогіяй [4]. Вера ў розум як крыніцу спазнання і пераўтварэння рэальнасці абумовіла імкненне да сацыяльных рэформаў, пашырэння асветы людзей, выхавання маральнасці і грамадзянскасці. Складвалася асаблівая канцэпцыя культуры – прымірэнне сарматызму з новаеўрапейскім светапоглядам, імкненне да еўрапеізацыі без адмаўлялення ад нацыянальнай самабытнасці. Падзелы Рэчы Паспалітай і страта дзяржаўнай незалежнасці аказалі вызначальны ўплыў на развіццё мастацтва ў 19 стагоддзі. Нягледзячы на неспрыяльную грамадска-палітычную сітуацыю, былі свядома зроблены захады да захавання нацыянальнага ў культуры. Такое становішча адпавядала еўрапейскім асветніцкім ідэям, згодна якім мастацкая культура павінна была служыць айчыне і народу. У мастацтве, якое развівалася на землях былой Рэчы Паспалітай, пераважалі ўжо не дакументальная і ідэалагічная, а выхаваўча-патрыятычная і грамадска-пераўтваральная функцыі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

У эпоху Навейшага часу ў беларускай мастацкай культуры адбывалася супярэчлівае ўзаемадзеянне агульнаеўрапейскага ірацыяналізму і мадэрнізму з нацыянальнай традыцыяй [5]. Адмаўленне ад асветніцкай парадыгмы прывяло да новага бачання ролі мастацтва ў грамадстве. Найноўшае нерэалістычнае мастацтва, прадстаўленае мноствам розных стыляў, не павінна было прапаведаваць грамадскія каштоўнасці. Яго выхаваўча-патрыятычная функцыя страчвала сваё значэнне, а ўзрастала экзістэнцыяльная, якая акрэслівалася як раскрыццё індывідуальнага існавання чалавека.

Такім чынам, на падставе даследавання сацыякультурных функцый беларускага мастацтва можна зрабіць выснову, што ў пэўныя гісторыка-культурныя перыяды ў ім пераважалі розныя функцыі: у эпоху Адраджэння – дакументальна-інфармацыйная і светапоглядна-ідэалагічная, Новага часу – выхаваўча-патрыятычная і грамадска-пераўтваральная, Навейшага часу – экзістэнцыяльная і эстэтычная.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Хренов, Н.А., Дуков, Е.В., Жидков, В.С., Соколов, К.Б. Введение в социологию искусства / Н.А.Хренов, Е.В.Дуков, В.С.Жидков, К.Б.Соколов. – Санкт-Петербург: Алетейя, 2001. – 256 с.
2. Патапенка, Н.Я. Гісторыя культуры Беларусі / Н.Я.Патапенка, А.В.Перапёлкіна. – Мінск: Изд-во Гревцова, 2009. – 208 с.
3. Лазука, Б.А. Беларускае мастацтва ад старажытнасці да канца XVI стагоддзя // Лазука, Б.А. Гісторыя сусветнага мастацтва / Б.А.Лазука. – Мінск: Беларусь, 2010. – С. 215-308.
4. Лазука, Б.А. Беларускае мастацтва XVII і XVIII стагоддзяў // Лазука, Б.А. Гісторыя сусветнага мастацтва. XVII-XVIII стст. / Б.А.Лазука. – Мінск: Беларусь, 2010. – С. 52-113, 172-251.
5. Лазука, Б.А. Беларускае мастацтва XIX – пачатку XX стагоддзя // Лазука, Б.А. Гісторыя сусветнага мастацтва / Б.А.Лазука. – Мінск: Беларусь, 2011. – С. 323-426.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ